20. Сям'я і сямейны побыт беларусаў. – Міснк : Ураджай, 1990. – 240 с.
21. Сысоў, У. З крыніцспрадвечных / У. Сысоў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 416 с.
22. Шэйн, П. Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю / П. Шэйн.– СПб., 1902. – Т. 3. – 360 с.
23. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэд. І. Шамякін. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

*Іна Алексніна*

## МУЖЧЫНСКІЯ АНТРАПАМОРФНЫЯ КАЛЯДНЫЯ ПЕРААПРАНАННІ ЖЫХАРОЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я

*У артыкуле апісваюцца найбольш характэрныя мужчынскія антрапаморфныя калядныя пераапрананні, што бытавалі ў першай палове XX стагоддзя на тэрыторыі Заходняга Паазер'я.*

*Іна Алексніна*

## MEN'S ANTRAPAMORPHIC CHERRY CHRISTMAS IMAGE SHIFT IN WEST LAKE DISTRICT

*This article describes the most typical male anthropomorphic Christmas dressing used in the 1st half of the 20th century in West Lake District.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самым «тэатральным» святам беларускага земляробчага календара на тэрыторыі нашай краіны былі Каляды. Святкаванне Каляд адбывалася з 24 снежня па 6 студзеня і было прымеркавана да дня «адраджэння» сонца, якое паварочвала на лета, несла цяпло і давала новыя спадзяванні на гадавы дабрабыт і дастатак у гаспадарцы. Менавіта калядныя святы здзіўляюць багаццем мастацкіх колераў, выяўляюць элементы маскараду ў традыцыйных абыходах вёсак калядоўшчыкамі, даюць волю выявіць свае мастацкія здольнасці і таленты кожнаму ўдзельніку своеасаблівага карнавала.

Калядныя пераапрананні былі вельмі распаўсюджаны практычна па ўсёй тэрыторыі сучаснай Беларусі пачынаючы з X ст. У Гусцінскім летапісе аўтар адзначае «сему бесу (коляде) в память простая чадь сходяться в навеченіе Рождества Хрістова и поют песни некіе, в нихъ же аще и о Рождестве Христовомъ поминають, но более коляду беса величают» [5, с. 77].

Маскіраванне і пераапрананні на Каляды сустракаюцца як па ўсёй Беларусі, так і на тэрыторыі даследуемага намі рэгіёна і ў XIX – пачатку XX стагоддзяў.

Калядных персанажаў даследчыца Т. І. Кухаронак падзяляе на тры асноўныя групы: зааморфныя – каза (казёл), мядзведзь, кабыла (конь), бусел (жораў, журавель), бык (тур, карова), воўк, ліса, заяц; антрапаморфныя – дзед (старац), баба (старчыха, баба Яга), цыган і цыганка, яўрэй і яўрэйка, афіцэр (салдат, гусар, генерал, казак,ураднік, улан, гайдук), які часцей за ўсё выступаў у пары з маладзіцай (барыняй), пан (паніч) і паненка, цар або кароль, поп і дзяк, доктар (фельчар, венгр-аптэкар, лекар-аптэкар) пастух, грабаўшчык, ямшчык, сват, плакальшчыца; міфічныя істоты – анёл, шчодра (шчадрыца), чорт (д'ябал), смерць, каляда, ведзьма [2, с. 16].

З антрапаморфных мужчынскіх калядных пераапрананняў для рэгёна найбольш характэрныя вобразы «дзеда» (якога многія інфарматары пад уплывам сучасных разуменняў называюць «дзед-мароз») і «цыганоў». Выдатны польскі даследчык К. Машыньскі ў манаграфіі «Kultura ludowa slowian» змяшчае апісанні і выявы масак калядоўшчыкаў з вёскі Цяцеркі Браслаўскага раёна, якія сведчаць аб дастаткова высокім майстэрстве народных умельцаў у вырабе масак адпаведнага тыпу. Маска «дзеда» зроблена з бяросты і льну, а «цыгана» – са скуры і воўны [4, с. 289-290].

Найбольшай папулярнасцю ў рэгіёне карысталіся таксама вобразы «цыган». Трэба адзначыць, што прадстаўленні з іх удзелам ладзілі не толькі дарослыя, але і дзіцячыя гурты. Напрыклад, у в. Вайнюнцы на Браслаўшчыне на другі дзень каталіцкага свята «Тшы крулі» («Тры каралі»), якое святкавалі 7 студзеня, дзеці (як хлопчыкі, так і дзяўчынкі), апранутыя ў дарослае адзенне, прадстаўлялі «цыган».

Выканаўцы імкнуліся не толькі да вонкавага падабенства, якога дасягалі з дапамогай пераапранання, выкарыстання натуральнага грыму (сажа, буракі) і рэквізіту (маністы, хусткі, бразготкі), але і сваімі паводзінамі, спевамі, танцамі, варажбой), імкнуліся найбольш характэрна паказаць пластыкай, мовай прадстаўляемыя вобразы [3].

Зусім рэдка, але сустракаюцца ў рэгіёне пераапрананні ў «ямшчыкоў», якія разам з «цыганамі» рыхтавалі «звязду», упрыгожвалі коней і ездзілі па вёсках калядаваць. Касцюм "ямшчыка" складаўся з шапкі, буркі, падперазанай вяроўкай, штаноў і пугі. Калядныя ямшчыкі выконвалі функцыі сапраўдных ямшчыкоў – вазілі калядоўшчыкаў на павозках.

Не характэрным для вывучаемай часткі Беларусі было і пераапрананне ў «яўрэяў». Магчыма, гэты факт абумоўлены тымі абставінамі, што на Дзісненшчыне да Вялікай Айчынай вайны асобы яўрэйскай нацыянальнасці складалі большую частку насельніцтва, а ў некаторых мястэчках (Браслаў, Докшыцы) да 1939 г. іх было амаль 80% ад агульнай колькасці жыхароў. Адсутнасць вобраза «яўрэя» у калядаванні на тэрыторыі даследуемага рэгіёна можна растлумачыць маральна-эстэтычнымі паняццямі, павагай да сваіх суседзяў.

Яшчэ адным тыпам каляднага пераапранання і вандравання, якое мела пэўныя адрозненні ад тэрыторый Цэнтральнай і Усходняй Беларусі, быў абрад хаджэння «Трох каралёў» на гэта каталіцкае свята. Яно атрымала назву ў гонар трох каралёў Каспара, Мельхіёра і Балтазара, якія, згодна біблейскаму паданню, прыйшлі на святло Віфлеемскай зоркі, каб пакланіцца нованароджанаму Ісусу Хрысту. Абрад характэрны для населеных пунктаў, дзе пераважную большасць насельніцтва складалі католікі, якія не калядавалі 25 снежня. Нельга не адзначыць падабенства ў прынцыпах калядавання і рэпертуары «звяздароў» і «Трох каралёў».

Найбольш цікавыя варыянты гэтага звычаю зафіксаваны на Пастаўшчыне і, часткова, на Браслаўшчыне, дзе акрамя «каралёў» у гурце ўдзельнічалі і іншыя персанажы: «анёл», «чорт», «пастушкі». Напрыклад, у в. Лынтупы збіралася 6-7 хлопцаў, якія бралі дазвол на хаджэнне па сваёй парафіі і рыхтаваліся да абыходу вёсак. На галаве кожнага «караля» была высокая бліскучая шапка, падобная на шалом. Вопратка – вышываная, упрыгожаная накшталт адзення ксяндзоў («комжы»). У руках яны трымалі доўгія апрацаваныя палкі, якія нагадвалі посахі. На вяршыні шаломаў і посахаў замацоўваліся выразаныя і размаляваныя фігуркі каралёў. Паводзіны «каралёў», «анёла» і «пастушкоў» былі прадыктаваны рэлігійнымі канонамі, хоць ад іх і патрабаваліся знешнія даныя, валоданне голасам і пластыкай. Жывінку ўносіў «чорт», для выканання ролі якога выбіралі найбольш жвавага, артыстычнага хлопца. Яго апраналі ў чорнае адзенне або вывернуты кажух, вымазвалі твар сажай, прычаплялі рогі, бараду, хвост, у які (з мэтай абароны ад дзяцей) тыкалі шпількі. Ён паводзіў сябе адпаведна вобразу: пужаў дзяцей, заігрываў з гаспадынямі, «спакушаў» іх [1].

Падводзячы вынікі, хацелася б падкрэсліць, што на тэрыторыі Заходняга Паазер'я з мужчынскіх антрапаморфных калядных пераапрананняў у першай палове XX стагоддзя найбольш часта сустракаліся пераапрананні ў дзеда, цыганоў, ямшчыкоў і каралёў. Яшчэ адной значнай асаблівасцю святкавання Каляд на тэрыторыі Заходняга Паазер'я было і тое, што большасць насельніцтва рэгіёна складалі жыхары каталіцкага і праваслаўнага веравызнання. Аднак сустракаліся і вёскі, амаль ўсё насельніцтва якіх складалі стараверы. У такіх вёсках традыцыі калядаваць і пераапранацца ў іншых персанажаў не было.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што наяўнасць альбо адсутнасць тых або іншых мужчынскіх антрапаморфных персанажаў у час святкавання Каляд залежала не толькі ад сацыяльных, палітычных, эканамічных, культурных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі тагачаснай Беларусі, але на іх уплывала і блізкасць тэрытарыяльных межаў з Расіяй (наяўнасць персанажа «ямшчык»), і веравызнанне («Тры каралі», адсутнасць звычаю калядавання ў старавераў).

**Спіс літаратуры:**


1. Вялікдзень, Купалле, «Тры каралі», «Яшчур» – запісала Т. Гарошка ў 1992 г. у г.п. Лынтупы, в. Сакуны, Васіліны Пастаўскага раёна. Інфарматары: Г.А. Собаль (1914 г.н., в. Заброддзе); К.М. Вароўка (1916 г.н., в. Забродзе); Г.У. Грынько (1916 г.н., в. Камаі); Г.Б. Пяткевіч (1914 г.н., в. Сакуны); А.В. Гутар (в. Шыркі), Г.П. Танана (г.п. Паставы).
2. Кухаронак, Т. Маскі ў каляднай абраднасці беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с., іл.
3. Масленіца, чаплянне «калодкі», Каляда – запісала А.Котава ў 1997 г. у в. Вайнюнцы Браслаўскага раёна ад Т. Крывель (1923 г.н.), Г. Крывель (1921 г.н., в. Заборнікі) і А. Кулікоўскага (1921 г.н., в. Мурмішкі Браслаўскага раёна).
4. Moszynski, K. Kultura ludowa slowian: U. 2 t. / K. Moszynski. – Warshawa, 1968. – T. 2. – Cz 2. – 1107 s.
5. Полное собрание русских летописей. – Т. 1. – II. – СПб. : Тип. Эд. Праца, 1986. – 267 с.



*Алег Хаменка*


**РАДАЎНІЦА – ВЕЕР ХАРАКТАРЫСТЫК: АД ФОЛК-БРАМЫ ДА ЭТНА-ЛАБІРЫНТА**


*У артыкуле падкрэсліваецца, што сярод усіх краін свету толькі ў Беларусі Радаўніца з'яўляецца агульнанацыянальным дзяржаўным святам. За апошнія дзесяцігоддзі былыя традыцыі святкавання Веснавых дзядоў значна змяніліся ў сувязі з паступовым узмацненнем святкаваня Радаўніцы ўсёй краінай.*



*Aleh Khamenka*


**RADUNITSA – THE FAN OF CHARACTERISTICS: FROM FOLK GATE TO ETHNO-MAZE**


*The article emphasizes that only in Belarus among all countries of the world Radunitsa is a national public holiday. Over the past decade, the former tradition of celebrating spring grandfathers days significantly changed due to the gradually strengthening influence of celebrating Radunica by the entire country.*


Як вядома, старажытнае традыцыйнае свята так бы мовіць «пасляраўнадзення» (моманту, калі светлавы дзень пасля раўнадзенства вясны становіцца відавочна больш працяглым, чым ноч) атрымала у нас назву Вялікдзень. У прывязцы да хрысціянскай міфалогіі ў некаторых славянскіх народаў яно завецца Вяліканоч у гонар уваскрасення Збавіцеля, якое адбылося ўначы. У дахрысціянскія і раннехрысціянскія часы менавіта ад Вялікадня нашы продкі лічылі пачатак Навалецця, своеасаблівага Новага году (новага гаспадарчага сезону аграрыеў), і ў сувязі з гэтым вызначэнне моманту пасляраўнадзення кожны год удакладнялася асобна – з улікам з'яўлення Маладзіка (а месяцовы каляндар «не супадае» з сонечным) і працягласці светлавога дня. Сапраўды, зараз я пераправяраю версію, што тысячу гадоў таму нашыя продкі адзначалі Вялікдзень у найбліжэйшы чацвер («чысты чацвер») пасяля раўнадзенства вясны і пасля наступнай за ім першай поўні. Пакуль пераканаўча гэта сцвярджаць не магу, але аргументаў нямала.

У сёняшні час паняцці Вялікдзень і Пасха настолькі глыбока паядналіся як ў розных міфалогіях, так і свядомасці нашага народа, што цяпер гэта суцэльная непарыўная з'ява. Па-выніку – мы гаворым, што Вялікдзень – гэта Пасха, але па-беларуску… Аднак грамадскага выкарыстання беларускага слова Вялікдзень у шырокім ужытку сёння не назіраецца, а слова Пасха вельмі актыўна ўжываецца ў СМІ і рэлігійнымі дзеячамі, што можа прывесці да стану, калі слова Вялікдзень будзе ўяўляцца анахранізмам.

Старазапаветны Вялікдзень, як і цяперашняе свята Пейсах (яўрэйскі Вялікдзень), святкавалася ў гонар выхаду яўрэяў з Егіпту. Свята гэта мела сімволіку легенды пазбаўлення ад рабства, або, кажучы сучаснымі словамі, гэта быў амаль Дзень незалежнасці (для яўрэяў). Як вядома, дата Пейсаха была дакладнай – вячэра з 14-га на 15-ты дзень месяца Ніссан. Аднак, у гістарычных варунках асірыйска-габрэйскі каляндар быў амаль згублены, і месяц нісан (а гэта першы месяц новага тагачаснага году яўрэяў) настолькі пасунуўся ў датах і з'явах прыроды, што, якому месяцу ён адпавядае ў нас зараз, мы ведаем толькі згодна пазнейшых рэканструкцый і лічым, што нісан – гэта месяц паміж сакавікам і красавіком. Назва «пейсах» на іўрыце значыць «мімаходам», і яна глыбока звязана з легендамі пра Дзесяць караў егіпецкіх. Важна дадаць, што сімвал ахвяравання «Пасхальнага Ягня» таксама завецца «Пейсах», і такое ўжыванне слова можна знайсці, у прыватнасці, у кананічных апавяданнях евангелістаў пра Таемную Вячэру.

З прыняццем хрысціянства еўрапейцамі і паступовым аб'яднаннем даўнішніх вялікодных традыцый і Новазаветных правілаў, святкавання Пасхаліі, свята Вялікадня-Пасхі атрымала абноўлены духоўна-сакральны сэнс і цяпер з'яўляецца выключна ўрачыстым і па сутнасці стрыжнёвым, галоўным хрысціянскім святам, ад даты якога (кожны год) мы лічым і пачатак Масленіцы, і пачатак Вялкага посту, Вербную-Пальмавую нядзелю, Радаўніцу і Сёмуху-Тройцу. Захаванне народна-грамадскіх традыцый паслядоўнай падрыхтоўкі да Вялікадня сёння ўжо амаль не прасочваюцца. Пры тым, што большасць людзей сталага ўзросту так ці інакш узгадвае, што на Белым тыдні (так зваўся перадпасхальны тыдзень) асабліва адказна ставіліся да традыцыі паставання. Нярэдка пост быў вельмі строгі. Паслабленне было на Вербніцу і ў чацвер, калі наводзілі парадак паўсюль у гаспадарцы, а таксама мыліся ў лазні або грэлі ваду для ночваў.

Адны сцвярджаюць, што падрыхтоўка да свята найбольш актыўнай была ў суботу, іншыя кажуць, што ў сераду:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ